**СЛОВАЗЛУЧЭННЕ** – сэнсава-граматычнае аб’яднанне слоў-кампанентаў (у сказе), якія звязаны сінтаксічнай сувяззю і выражаюць розныя адносіны паміж прадметамі, прыметамі, дзеяннямі. Прыметы словазлучэння: а) мінімальная колькасць самастойных слоў-кампанентаў; б) сінтаксічная непрэдыкатыўная сувязь слоў-кампанентаў у сказе; в) аб’яднанне слоў-кампанентаў у межах сказа; г) аб’яднанне, якое выражае розныя сэнсавыя адносіны.

Да словазлучэння некаторыя даследчыкі адносяць аб’яднанні не менш як двух самастойных слоў, а таму вылучаюць словазлучэнні: а) прэдыкатыўныя (спалучэнне дзейніка і выказніка); б) непрэдыкатыўныя (падпарадкавальныя і злучальныя).

У беларускай лінгвістыцы вывучэннем словазлучэння займаліся Т.П. Бандарэнка, М.Г. Булахаў, Л.І. Бурак, Г.Н. Клюсаў, В.У. Ляпёшкін, А.Я. Міхневіч, А.І. Наркевіч, Л.П. Падгайскі і інш.

У залежнасці ад ступені злітнасці кампанентаў вылучаюць:

**свабодныя** (сінтаксічныя, пераменныя) **словазлучэнні** – словазлучэнні, кампаненты якіх захоўваюць сваё самастойнае лексічнае значэнне і могуць свабодна ўступаць у граматычныя адносіны з іншымі словамі: *працаваць шчыра, доўга, з перапынкамі, з раніцы*; кожны структурны кампанент у свабодных словазлучэннях захоўвае сваё значэнне і ў сказе выконвае пэўную сінтаксічную функцыю;

**несвабодныя словазлучэнні** – словазлучэнні, кампаненты якіх лексічна несамастойныя, г.зн. з аслабленым ці страчаным лексічным значэннем, абазначаюць адно нерасчлянёнае паняцце (*даваць фаеру, купка дрэў*); пэўны кампанент іх можа мець пераносны сэнс: *ваду малоць*, *корань зла*, *чародка думак*; адрозніваюць:

***сінтаксічна непадзельныя*** – словазлучэнні, лексічна звязаныя, нечлянімыя ў пэўным кантэксце: *некалькі чалавек, (абутак) вялікага памеру*;

***фразеалагічна непадзельныя*** – словазлучэнні, устойлівыя ў сваім складзе і структуры, з адзіным цэласным значэннем: *да трох не гавары, слова закінуць, рогі падпілаваць*.

**I.** Паводле характару сувязі паміж кампанентамі і спосабу іх выражэння адрозніваюць:

**гіпатаксісныя словазлучэнні** – складаюцца з нераўнапраўных кампанентаў, што звязаны падпарадкавальнай сувяззю і з’яўляюцца рознымі членамі сказа:

***іменныя*** (*аб’ектыўная ацэнка*):

а) субстантыўныя: *літаратурнае асяроддзе*;

б) ад’ектыўныя: *па-сапраўднаму магутны*;

в) пранамінальныя: *хтосьці з гасцей*;

г) нумаратыўныя: *другі ад краю*;

***дзеяслоўныя*:** *выбрацца ў дарогу, пахадзіўшы па лесе, надрукаваны курсівам*;

***адвербіяльныя***: *недалёка ад рэчкі, па-ранейшаму позна*;

**паратаксісныя словазлучэнні** – складаюцца з раўнапраўных кампанентаў, што звязаны злучнікавай або бяззлучнікавай сувяззю і з’яўляюцца аднолькавымі членамі сказа:

***аднатыпныя*:**

***іменныя:***

а) субстантыўныя: *сшыткі ды кніжкі*;

б) ад’ектыўныя: *значны, моцны, яркі, самабытны (талент)*;

в) нумаратыўныя: *дзесяць або дзевяць*;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

г) пранамінальныя: *я і ты*;

***дзеяслоўныя і адвербіяльныя***: *гадавалі і мацавалі, зверху ды знізу*;

***неаднатыпныя*:**

а) субстантыўна-пранамінальныя: *я і сястра*;

б) субстантыўна-адвербіяльныя: *з асцярожнасцю і павольна*.

**II.** Паводле структуры адрозніваюць:

**простыя словазлучэнні**:

1) складаюцца з двух самастойных слоў: *зімні дзень, раніцай і вечарам*;
2) складаюцца з большай колькасці слоў-кампанентаў, калі адзін з іх выражаны аналітычнай формай: *буду шмат спяваць і танцаваць* або сінтаксічна і фразеалагічна непадзельным словазлучэннем: *хлопчык маленькага росту, сядзець і кляваць носам*;

**складаныя словазлучэнні** складаюцца з трох і больш самастойных слоў-кампанентаў; складаныя словазлучэнні ўтвараюцца на базе простых наступным шляхам:

1) далучэнне паясняльных слоў да галоўнага кампанента: *бачыць у працы – пастаянна бачыць у працы*;
2) далучэнне паясняльных слоў да залежнага кампанента: *бачыць у працы – бачыць у творчай працы*;
3) далучэнне паясняльных слоў да галоўнага і залежнага кампанентаў: *з задавальненнем бачыць у паўсядзённай працы;*
4) далучэнне паясняльных слоў да раўнапраўных кампанентаў: *лес і зімняя рэчка – ціхі лес і зімняя рэчка*.

**III.** Паводле сэнсава-граматычных адносін паміж кампанентамі паратаксісныя словазлучэнні бываюць:

**са спалучальнымі адносінамі** – словазлучэнні, якія паказваюць адначасовасць, сумеснасць або паслядоўнасць прадметаў, дзеянняў, з'яў: *пад'ехаў і ўбачыў, дзед і ўнук, (раслі толькі) палын ды кавыль*; *цёпла і ціха*;

**з размеркавальнымі адносінамі** – словазлучэнні, якія паказваюць чаргаванне або ўзаемнае выключэнне прадметаў і з'яў: *ці ўзад, ці ўперад*; *то цёмны, то светлы*;

**з супраціўнымі адносінамі** – словазлучэнні, якія паказваюць неадпаведнасць дзеянняў, прадметаў і з'яў: *не высокі, а нізкі*; *падраслі, але не выцягнуліся*;

**з градацыйнымі адносінамі** – словазлучэнні, якія паказваюць неадпаведнасную сумеснасць прадметаў, дзеянняў, з'яў: *не толькі не вывучылі, але і не вучылі*; *не падрыхтавала, ды і не рыхтавала*.

**IV.** Паводле сэнсава-граматычных адносін паміж кампанентамі гіпатаксісныя словазлучэнні бываюць:

**з аб'ектнымі адносінамі** – словазлучэнні, што паказваюць дзеянне і прадмет, на які яно пераходзіць прама або ўскосна ці толькі арыентуецца: *збіраць яблыкі, дзякаваць за гасцінцы, рэцэнзаванне артыкула*;

**з атрыбутыўнымі адносінамі** – словазлучэнні, што паказваюць прадмет і яго прымету: *першае выпрабаванне, дыск з фільмамі, шарсцяны жакет, будынак насупраць*;

**з акалічнаснымі адносінамі** – словазлучэнні, што паказваюць дзеянне і яго прымету або прымету прыметы: *пісаць хутка, вярнуцца раніцай, ісці лесам, плакаць ад радасці, вывучаны на памяць*;

**з суб'ектнымі адносінамі** – словазлучэнні, што паказваюць дзеянне і яго ўтваральніка: *чытаецца вучнямі, зламаны ветрам, гоман дзяцей*;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**з колькаснымі адносінамі** – словазлучэнні, што паказваюць меру, колькасць, частку: *чакаць з месяц, вучыцца паўгода*.

У беларускім мовазнаўстве існуе некалькі падыходаў да вывучэння словазлучэння і адпаведна яго тыпаў:

**лексічна-сінтаксічны падыход** (А.І. Наркевіч, Л.П. Падгайскі, Т.П. Бандарэнка і інш.): словазлучэнне як аб’яднанне двух і болей паўназначных слоў, звязаных падпарадкавальнымі адносінамі, г.зн. толькі падпарадкавальныя, або гіпатаксісныя, і адпаведна іх тыпы;

**традыцыйна-сінтаксічны падыход** (Г.Н. Клюсаў): словазлучэнне – любое двухчленнае спалучэнне слоў, у тым ліку і службовых, са знамянальнымі і між сабой (*не чую, ці так? сябры-таварышы, пад раніцу, на жаль*); вылучаюцца тыпы:

1) дэтэрмінацыйныя словазлучэнні: *ух ты! каля лесу*;
2) канекцыйныя словазлучэнні: *дзень і ноч, так ці не так*;
3) субардынацыйныя словазлучэнні: *верш Коласа, збірацца спаць*;

**кантамінацыйны падыход** (М.Г. Булахаў, Л.І. Бурак, В.У. Ляпёшкін і інш.): словазлучэнне – аб’яднанне мінімум двух самастойных слоў, г.зн.; прэдыкатыўныя і непрэдыкатыўныя (паратаксісныя і гіпатаксісныя).

У розных прадстаўнікоў кантамінацыйнага падыходу ёсць разыходжанні ў падыходзе да вызначэння аб’ёму словазлучэння і яго тыпаў.

**Віды сінтаксічнай сувязі кампанентаў словазлучэння** – граматычныя паказчыкі, якія адлюстроўваюць фармальнае выражэнне сінтаксічных адносін паміж кампанентамі словазлучэння.

**I.** Віды сувязі ў гіпатаксісных словазлучэннях:

**дапасаванне** – від падпарадкавальнай сувязі, пры якой залежны кампанент мае тыя ж граматычныя формы, што і галоўны; адрозніваюць:

а) ***поўнае дапасаванне*** – дапасаванне залежнага кампанента ва ўсіх магчымых формах: *у разгорнутай кнізе, свежыя навіны*;

б) ***няпоўнае дапасаванне*** – дапасаванне залежнага кампанента не ва ўсіх формах: *маладая доктар*;

**кіраванне** – від падпарадкавальнай сувязі, пры якой залежны кампанент ставіцца ў пэўнай склонавай форме, абумоўленай значэннем галоўнага кампанента або сэнсам усяго словазлучэння; адрозніваюць:

а) ***моцнае кіраванне*** – кіраванне, пры якім залежны кампанент мае форму толькі аднаго ўскоснага склону, якая вызначаецца лексічна-граматычнымі ўласцівасцямі галоўнага кампанента; найчасцей гэты тып кіравання магчымы пры пераходных дзеясловах з прамым аб’ектам (*правяраць сшыткі, купіць адзенне*); пры непераходных дзеясловах такое кіраванне магчымае, калі дзеясловы маюць прыстаўкі прасторавага значэння, а залежны кампанент ужываецца з прыназоўнікам, адпаведным прыстаўцы (*адплыць ад берага, злезці з лаўкі*);

б) ***слабае кіраванне*** – кіраванне, пры якім формы залежнага кампанента залежаць ад сэнсавых адносін і не залежаць ад лексічна-граматычных уласцівасцей галоўнага кампанента (*спыніліся каля лесу, спыніліся за лесам*); да залежнага кампанента можна паставіць пытанні розных членаў сказа (*дзе? каля чаго? за чым?*), пры моцным кіраванні – толькі аб’ектнае пытанне, пры прымыканні – толькі акалічнаснае пытанне;

1) ***прыназоўнікавае кіраванне*** – кіраванне з прыназоўнікам перад залежным кампанентам: *размаўляць з суседкай, дом з мезанінам*;

2) ***беспрыназоўнікавае кіраванне*** – кіраванне без прыназоўніка: *словы бацькі, чытаць артыкул*;

**прымыканне** – від падпарадкавальнай сувязі, пры якой залежны кампанент звязаны з галоўным толькі сэнсава; адрозніваюць;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

а) ***уласнае прымыканне*** – прымыканне, пры якім да галоўнага кампанента прымыкаюць нязменныя словы: *бегчы павольна, слухаць не перабіваючы, каманда збірацца*;

б) ***іменнае прымыканне*** – прымыканне, пры якім да галоўнага кампанента прымыкаюць ускосна-склонавыя формы назоўнікаў з аслабленым прадметным значэннем і выразна выражаным акалічнасным. Такія формы назоўнікаў блізкія да прыслоўяў: *казаць па праўдзе (праўдзіва), вывучыць на памяць*.

**II.** Віды сувязі ў паратаксісных словазлучэннях:

**з'яднанне** – адкрытая сінтаксічная сувязь, пры якой раўназначныя кампаненты аб'ядноўваюцца спалучальнымі злучнікамі або бяззлучнікавым спосабам: *светлы і ясны*; *вольхі, асіны ды бярозы*;

**раз'яднанне** – закрытая сінтаксічная сувязь, пры якой раўназначныя кампаненты супастаўляюцца паміж сабой пры дапамозе супастаўляльных злучнікаў або бяззлучнікавым спосабам: *прасторны, аднак халодны*; *не бегчы – ляцець*;

**пераз'яднанне** – адкрытая сінтаксічная сувязь, пры якой раўназначныя кампаненты чаргуюцца або ўзаемна выключаюцца, выражаючы размеркавальныя адносіны з дапамогай размеркавальных злучнікаў: *то нырау, то віўся, то ўліваўся*; *летам або зімой*; *ці ў лесе, ці на рэчцы*.

*М.С.Ржавуцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ